8. *Раманоўскі В. Ф.* Злачынныя мэты — злачынныя сродкі //Беларусь у гады другой сусветнай вайны: Матэрыялы рэсп. навук. канф. Мн., 1995. С. 26.
9. *Няміга Г.* Беларускае школьніцтва пад нямецкай акупацыяй у вайну 1941—1944 //Запісы: Беларускі інстытут навукі і мастацтва. Нью-Йорк, 1989. № 9. С. 103.
10. НА РБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 978, л. 74.
11. *Сервачынскі І. Ю.* Калабарацыянізм на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (1941—1944) //Весці БДПУ 1997. № 2. С. 62.
12. НА РБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 974, л. 232.
13. *Кнацько Н.* Минск в годы оккупации //Народная газета. 1993. 1 июля.
14. *Умрейко С. А., Залесский А. И., Кобринец П. Н.* Патриотизм учителей и школьников Белоруссии в борьбе против немецко-фацистских оккупантов. Мн., 1980. С. 81.
15. Известия. 1943. 24 сент.

*SUMMARY*

*The activity of the leader of General Comissariate of Belarus V. Cube during the period of occuhation of Belarus (1941—1944) in cultural-educational sphere was realized in cooperation with belarussian collabaranion. The intentions and content of occupational policy in schooling organization are revealed.*

УДК 9(476)(093)

*С. Я. Новікаў*

# БЕЛАРУСЬ НАПАЧАТКУ НЯМЕЦКАЙ АКУПАЦЫІ Ў ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ КРЫНІЦАХ ФЕДЭРАЛЬНАГА ВАЕННАГА АРХІВА ГЕРМАНІІ

Інтарэс беларускай навуковай грамадскасці да дакументальных крыніц Федэральнага ваеннага архіва Германіі сёння выкліканы тым, што ў ім захоўваюцца матэрыялы ваенных і грамадзянскіх устаноў Трэцяга рэйха, якія мелі дачыненне як да трохгадовай гісторыі нямецкай акупацыі Беларусі, так і непасрэдна да яе пачатку летам 1941 г.

Выяўленне канкрэтных матэрыялаў, іх першапачатковы разгляд і ўвядзенне ў навуковы ўжытак у кантэксце вывучэння праблем айчыннай ваеннай гісторыі — адна з задач аўтара гэтага артыкула. Апрача таго, чытач атрымае магчымасць для: *па-пер-*

*шае,* знаёмства з найбольш важнымі фондамі, у якіх адлюстравана гісторыя дзейнасці нямецкай акупацыйнай адміністрацыі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі; *па-другое,* аналізу дакументальных крыніц, што складаюць аснову для даследавання нямецкай эканамічнай палітыкі на ўсходзе ўвогуле і на тэрыторыі нашай краіны ў прыватнасці; *па-трэцяе,* агляду навуковых прац, у якіх на аснове архіўных матэрыялаў ужо знайшла сваё адлюстраванне гісторыя нямецкай акупацыі Беларусі.

Федэральны ваенны архіў Германіі — «BA-MA» ці «Бундэсархіў-мілітэрархіў» на сёння з'яўляецца адным з самых буйных цэнтраў, дзе захоўваюцца дакументы рознага паходжання: прускай імперскай арміі, паўночнанямецкага і кайзераўскага флоту, ахоўных войск і корпуса добраахвотнікаў, узброеных сіл Германіі — рэйхсвера і вермахта, войск СС; нацыянальнай народнай арміі і пагранічных войск ГДР, бундэсвера; пісьмовыя і архіўныя зборы; карты, планы, тэхнічныя малюнкі і інш. Збор, апрацоўка і захаванне гэтых матэрыялаў — вынік шматгадовай дзейнасці розных архіўных устаноў, у тым ліку і ваеннага архіва. Гісторыя апошняга пачалася ад Цэнтра дакументаў і матэрыялаў, створанага пры Інстытуце ваенна-гістарычных даследаванняў [1, с. 14] у Фрайбурзе (*зямля Бадэн-Вюртэмберг.* — **С. Н.**) — горадзе, вядомым усяму свету праз адзін з самых знакамітых сярэдневяковых універсітэтаў і не менш знакаміты гатычны кафедральны сабор «Мюнстэр». Менавіта ў Фрайбург у 1968 г. і была перавездзена частка ўжо існуючага больш за дзесяць гадоў Федэральнага архіва ў Кобленцы — IV аддзел, які пасля вяртання ў пачатку 1960-х гг. [1, с. 23] вывезеных у ЗША і Англію ў якасці трафеяў архіўных матэрыялаў практычна пераўтварыўся ў самастойны архіў.

Цікавасць да фондаў ваеннага архіва ўзрастае на падставе таго, што ў іх захаваны матэрыялы, без якіх беларускім гісторыкам сёння практычна немагчыма асвятліць сутнасць асобных пытанняў нямецкай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі. Прычым тэрыторыя БССР адной з першых патрапіла ў планы падрыхтоўкі ваеннай аперацыі «Барбаросы» і таму згадваецца задоўга да яе пачатку ў самых розных дакументах галоўнага камандавання ўзброеных сіл Германіі — вермахта. Дакладную карціну падзей, якія характарызуюць не толькі ход ваенных аперацый, а і дзейнасць нямецкага акупацыйнага рэжыму на Беларусі, можна ўявіць на падставе вывучэння "Паведамленняў аб падзеях" і "Рапартаў з занятых усходніх тэрыторый" — дакументаў, якія рэгулярна паступалі ў штаб рэйхсфюрэра СС, паліцыі і бяспекі Германіі. Гэтыя дакументы аўтарам выяўлены ў некалькіх фондах — "R 19, R 20, R 58" [2], сярод якіх найбольшы інтарэс вы-

клікаюць матэрыялы начальнікаў паліцыі парадку і бяспекі, службаў бяспекі. Менавіта ў іх паказаны «вынікі» дзейнасці такіх паліцэйскіх фарміраванняў, якія безадказна выконвалі загады галоўнага начальніка СС і паліцыі на тэрыторыі Расіі-цэнтр і Беларусі з мэтай вынішчэння «ворагаў нацыянал-сацыялізму» [3]. Побач з паліцэйскімі фарміраваннямі на акупіраванай тэрыторыі дзейнічалі мабільныя спецкаманды ці «айнзатцгрупы» паліцыі бяспекі і СД. Кожнае з гэтых падраздзяленняў пакінула шэраг дакументальных матэрыялаў, сярод якіх паведамленні, справаздачы, загады, а таксама журналы баявых дзеянняў, у якіх занатаваны аперацыі паліцэйскіх часцей на тэрыторыі Беларусі супраць мясцовага насельніцтва, партызан, яўрэяў, камуністаў і інш. Частка матэрыялаў падобнага кшталту знаходзіцца ў фондзе “R 70” [4], аднак у ім захаваліся данясенні і рапарты “айнзатцгруп” на працягу толькі верасня 1941 — сакавіка 1942 г.

Важнасць іншых матэрыялаў палягае з іх непасрэднай прыналежнасці да адной з першых грамадзянскіх устаноў — Германскага міністэрства [5] па занятых усходніх тэрыторыях, створанага менш чым праз месяц пасля пачатку ваеннай аперацыі на ўсходзе. У фондзе “R 6” [6] захаваны загады і распараджэнні вышэйшага кіраўніцтва Германіі, а таксама адпаведныя дакументы кіраўніцтва міністэрства, якое стварала сістэму адміністрацыйнага кіравання з рэйхскамісарыятамі, генеральнымі акругамі і акруговымі камісарыятамі, гарадскімі камісарамі, г. зн. усімі, хто быў адказны за вырашэнне самых розных арганізацыйных пытанняў, выкананне 4-гадовага плана і заданняў для вермахта, выкарыстанне рабочай сілы і г. д. Вялікая колькасць дакументаў рэйхскамісара Остланда захоўваецца ў фондзе “R 90” [7], дзе апрача загадаў і распараджэнняў рэйхсміністра Розенберга і рэйхскамісара Лозэ па арганізацыі работы новай грамадзянскай адміністрацыі на акупіраванай тэрыторыі і правядзенні арганізацыйнай, палітыка-прапагандысцкай работы сярод мясцовага насельніцтва знаходзяцца справаздачы аб выкананні розных мерапрыемстваў у адпаведнасці з указаннямі вышэйшага кіраўніцтва нацысцкай Германіі. Над выкананнем загадаў і распараджэнняў рэйхскамісара на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусь працавалі службы Генеральнага камісарыята ў Мінску.

Знаёмства з замежнымі архіўнымі фондамі міністэрства Розенберга і генеральнага камісара Кубэ дазваляе прыйсці да цікавага параўнання з улікам агульнай колькасці матэрыялаў, узятых, напрыклад, сёння на ўлік у Федэральным ваенным архіве ў Фрайбурзе, Расійскім дзяржаўным ваенным архіве ў Маскве і ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у Мінску. Атрымоўваецца, што амаль удвая больш дакументаў аб дзейнасці міністэрства сёння знаходзіцца не ў Фрайбургу, а ў Маскве, у былым

«асобым архіве» (зараз гісторыка-дакументальная калекцыя Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва Ф. 1358К [8]). У дачыненні да архіва генеральнага камісара Кубэ неабходна адзначыць, што ў фондзе "R 93" [9] Федэральнага архіва Германіі захавалася толькі 18 дакументаў па асабовым складзе і справаздачы аб эвакуацыі з Беларусі (у параўнанні з 3421 адзінкамі захоўвання ў НА РБ [10]).

Асобны напрамак складаюць дакументы ваенных службаў вермахта, войск СС і паліцыі, якія дзейнічалі на тэрыторыі рэйхскамісарыята Остланд. Напрыклад, у фондзе "RW 41" [11] захаваны дакументы камандуючага вермахтам аб дзейнасці войск бяспекі па ахове занятай тэрыторыі, ахове дарог і сродкаў транспарту, прадуктаў харчавання і г. д. Да ўсяго, дакументы камандуючага вермахтам на тэрыторыі Беларусі ўтрымліваюць планы мерапрыемстваў па забеспячэнні бяспекі і арганізацыі барацьбы супраць партызан. Такую задачу мелі і іншыя вайсковыя падраздзяленні, напрыклад, камандуючы тылам на тэрыторыі групы войск (фонд "RH 22") і камендант армейскай тылавой вобласці (фонд "RH 23"). Шматлікія і рэгулярныя (тыднёвыя, паўмесячныя і месячныя) рапарты і данясенні камандуючага і каменданта ўключалі паведамленні аб дзейнасці камендатур, войск палявой жандармерыі і спецыяльных ахоўных частак, якія забяспечвалі ахову ваеннапалонных і інш. У дачыненні да апошніх існуе спецыяльны фонд "RH 49", у якім сабраны матэрыялы аб лагерах ваеннапалонных, працоўных і будаўнічых батальёнах, удзеле ваеннапалонных разам са спецыяльнымі рабочымі камандамі ў выкананні заданняў на вытворчасці і ў сельскай гаспадарцы, для правядзення розных работ і г. д.

Адным з самых закрытых ці малавядомых для айчынных даследчыкаў з'яўляецца фонд "N 756/197" ці фонд "30-й грэнадзёрскай дывізіі войск СС (беларускай № 1)" [12], у якім у асноўным сабраны матэрыялы аб гісторыі фарміравання спачатку беларускай брыгады СС, а потым беларускай грэнадзёрскай дывізіі. Гісторыя гэтых фарміраванняў паказана на кароткім адрэзку часу ад 01.01.45 да 20.04.45 г., калі спачатку ствараецца беларускі полк, а з 10 лютага — дывізія. Апрача таго, матэрыялы ўтрымліваюць дакументы, з якіх вынікае папярэдняя гісторыя розных паліцэйскіх фарміраванняў, у тым ліку створаных на тэрыторыі Беларусі: у раёнах Стаўбцоў, Слоніма, Глыбокага, Слуцка, Баранавіч, Вілейкі, Быценя, Ганцавіч, Ліды. Аднак асабовы склад гэтых фарміраванняў, за невялікім выключэннем, у справах адсутнічае на падставе агульнага рашэння архіўных службаў стварыць спецыяльны архіў па асабоваму ўліку ваеннаслужачых вермахта (сёння знаходзіцца ў Аахене. — ***С. Н.***). Сярод іншых фондаў неабходна звярнуць увагу на дакументы Рускай вызваленчай арміі

(фонд "N 756/195" [13]), асабліва на загады начальніка СС і паліцыі Расія-цэнтр і Беларусі, дзённікі баявых дзеянняў 9-га армейскага корпуса, начальніка паліцыі парадку і інш. Сярод матэрыялаў сустракаюцца звесткі аб дзейнасці беларускіх паліцэйскіх фарміраванняў, асабліва тых, якія ў складзе брыгады Камінскага бралі ўдзел у шэрагу ваенных аперацый на тэрыторыі Беларусі.

Рознабаковае вывучэнне гісторыі нямецкай акупацыі Беларусі сёння ўжо практычна немагчыма правесці без пошуку арыгінальных дакументаў аб эканамічнай палітыцы Германіі, якая мела працяг на акупіраванай тэрыторыі ў нацысцкай стратэгіі яе каланіяльнай эксплуатацыі разам з людскімі і прыроднымі рэсурсамі. Цэнтральным фондам, дакументы якога ўтрымліваюць розныя матэрыялы аб развіцці ваеннай эканомікі Трэцяга рэйха і ўключэння ў яе новых захопленых зямель, з'яўляецца фонд "R 84" [14] — фонд рэйхсмаршала Герынга — упаўнаважанага па чатырохгадовым плане: па забеспячэнні ваеннай эканомікі Германіі сыравінай і працоўнымі рэсурсамі; па выкарыстанні прымусовай працы "остарбайтэраў", жанчын, ваеннапалонных на тэрыторыі рэйха, а таксама па эканамічнай эксплуатацыі занятых усходніх тэрыторый.

Звесткі аб эканамічным выкарыстанні ўстановамі і службамі Герынга тэрыторыі Беларусі сустракаюцца ў справаздачах цэнтральнага гандлёвага таварыства "Ост", створанага 17 ліпеня 1941 г. і скіраванага на першачарговае забеспячэнне прадуктамі харчавання патрэб рэйха і ўзброеных сіл. Нарыхтоўка і збыт прадукцыі сельскай гаспадаркі паказаны ў розных справаздачах, статыстычных звестках, планавых заданнях і інш. На Беларусі гандлёвае таварыства "Ост" мела сваю галоўную кантору ў Барысаве і было адказным за нарыхтоўку зерня, мяса, тлушчу, жывёлы, алею, а таксама за кіраванне сельскагаспадарчай маёмасцю. Асобныя пытанні будоўлі мастоў, рамонту дарог, гарадскога будаўніцтва ў вобласці, дзейнасці ваеннай і грамадзянскай адміністрацыі, а таксама добраахвотнага і прымусовага выкарыстання працоўнай сілы на самых розных работах пад час акупацыі Беларусі адлюстраваны ў матэрыялах упаўнаважанага па будаўнічай гаспадарцы на ўсходзе ўвогуле і на Беларусі ў прыватнасці — арганізацыі Тодта "R 50 I" [15].

Асаблівы інтарэс у айчынных даследчыкаў могуць выклікаць матэрыялы ваенна-эканамічных устаноў Трэцяга рэйха, перш за ўсё фондаў "RW 19", "RW 31", "RW 46". У кожным з іх захоўваюцца дакументы па эканамічным выкарыстанні Беларусі ў ваеннай эканоміцы Германіі. Напрыклад, матэрыялы першага і апошняга фондаў, адпаведна "RW 19" [16] і "RW 46" [17], складаюць у асноўным штодзённыя, паўмесячныя, месячныя паве-

дамленні розных эканамічных службаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі: каманд забеспячэння, аддзелаў гаспадаркі пры палявых і мясцовых камендатурах, палявых гаспадарчых каманд, ваенна-гаспадарчых рот і інш. Галоўная задача, якая была пастаўлена 01.09.41 г. вышэйшым кіраўніцтвам, тычылася "забеспячэння войск прадуктамі харчавання з той краіны, на якой яны знаходзяцца". Такі загад пераўтвараў менавіта Беларусь у галоўны рэгіён, які забяспечваў групу армій "Цэнтр" хлебам, мясам, бульбай, а таксама лесам, прамысловымі вырабамі, рабочай сілай і інш.

Аб'ектыўнасць вывучэння праблемы экамамічных зносін Германіі і Беларусі ў гады нямецкай акупацыі патрабуе звароту да фонду "RW 31" [18] ці фонду "Эканамічнага штаба Ост", больш вядомага айчыннаму даследчыку пад назвай "Ольдэнбург". Нагадаем, што яго структуру ўтваралі 6 галоўных аддзелаў, у тым ліку: выкарыстання рабочай сілы, прамысловасці, лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўкі, сельскай гаспадаркі, вытворчага развіцця і перападрыхтоўкі, горнай справы. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі актыўна дзейнічала больш паловы з іх, пра што сведчаць месячныя, паўмесячныя і нядзельныя справаздачы, якія рэгулярна накіроўвалі ў штаб з эканамічнай інспекцыі "Цэнтр", а таксама квартальныя і паўгадавыя дзённікі гаспадарчых каманд Бабруйск, Барысаў, Віцебск, Гомель, Клімавічы, Лепель, Магілёў, Орша, Полацк.

Даследаванне дзейнасці кожнай з іх у прыватнасці, як і самой эканамічнай інспекцыі ўвогуле, — задачы, якія палягаюць з наяўнасці вялікага масіву дакументаў па гісторыі Беларусі перыяду акупацыі, з аднаго боку, а з другога — нераспрацаванасці гэтай праблемы з іх выкарыстаннем у сучаснай айчыннай гістарычнай навуцы. Апошняе становіцца больш відавочным, калі звернемся да асобных дакументаў.

Першым назавём дакумент, пакуль малавядомы айчыннаму даследчыку як архіўная крыніца. Вывучэнне яе патрабуе кароткага звароту да факта стварэння эканамічнага штаба Ост, дзейнасць якога прадвызначалася планам ваеннага нападу на СССР, планам "Барбароса" і з'яўлялася, такім чынам, неад'емнай функцыяй галоўнай арганізацыі германскіх узброеных сіл — вермахта. "*1.) Вайна можа падаўжацца толькі тады, калі ўвесь вермахт на трэцім годзе вайны будзе харчавацца з Расіі*" [19] (пераклад аўтара. — **С. Н.**). Аднак пры распрацоўцы плана па выяўленні, уліку і нарыхтоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў прадстаўнікі вышэйшага ваеннага кіраўніцтва прапанавалі жудасны план атрымання лішкаў прадуктаў, у якіх можа ўбачыць вострую патрэбу нямецкі вермахт у выпадку яго знаходжання на занятай савецкай тэрыторыі, у тым ліку Беларусі. Звернемся да

другога пункта той праграмы, якая стала вядомай на Нюрнбергскім працэсе, аднак не была прынята ў якасці гістарычнага і навуковага факта. Толькі дзякуючы пошуку даследчыкаў з Германіі — Бернгарду К'яры і Хрысціяну Герлаху — у 1990-я гэты дакумент упершыню трапляе ў нямецкі друк і часткова знаёміць чытачоў з другім палажэннем: *"2.) Пры гэтым без сумніву дзесяткі людзей будуць галадаць, калі неабходнае для нас намі будзе забірацца з краіны"* [20]. На практыцы гэты факт атрымаў сваё злачыннае padaўжэнне, якое адлюстравана ў адным з дакументаў фонда.

Спынімся на рукапісу працы *"Харчовая прамысловасць і сельская гаспадарка Беларускай савецкай рэспублікі"*, якая была падрыхтавана ўдзельнікам нямецкай акупацыі Беларусі ў гады першай сусветнай вайны дыпламаваным спецыялістам-лесаводам Е. фон Энгельгардтам[1] яшчэ да пачатку ваенных дзеянняў супраць СССР. Якраз на старонках яго рукапісу і з'явіліся заўвагі-падкрэсліванні з надпісамі, выкананымі чырвоным алоўкам, напрыклад:

> *"sollen sterben!"* "З трох сельскагаспадарчых сямей дзве павінны абавязкова забяспечыць для рэйха пастаўку аднаго работніка (ад 16 да 40 гадоў для розных палоў), прычым большай часткай у якасці сезонных рабочых, меншай — як кантрактных работнікаў з абавязкам працы ў сельскай гаспадарцы на некалькі гадоў..." [21].
>
> *"sterben!"* "...гэта тэрыторыя альбо беларуская краіна здолела б пастаўляць у рэйх на год, нават на дзесяцігоддзі амаль 1.000.000 [22] бездакорных работнікаў для сельскай гаспадаркі, з жаданнем і здольнасцю да любой сельскагаспадарчай працы..." [22] (пераклад аўтара. — ***С.Н.***).

Сярод іншых надпісак выдзелім яшчэ адну, якая зроблена ў самым пачатку рукапісу ў дачыненні да колькаснага складу гарадскога і сельскага насельніцтва БССР напярэдадні яе акупацыі. На правым баку аркуша былі таксама зроблены наступныя надпіскі:

---

[1] Е. фон Энгельгардт — прыбалтыйскі немец, у час першай сусветнай вайны служыў у асобым штабе нямецкіх войск у Мінску і Оршы. Па выяўленых сучасным нямецкім даледчыкам Хрысціянам Герлахам матэрыялах, з 1944 г. Энгельгардт быў кіраўніком аддзела лясной гападаркі і дрэваапрацоўкі акруговага камісарыята ў Навагрудку. Ён жа — аўтар вядомай кнігі: *Engelhardt Eugen von.* Weißruthenien. Volk und Land. Berlin; Amsterdam; Wien und Prag, 1943.

"Суадносіны паміж гарадскім і сельскім насельніцтвам ва ўсёй БССР на гэты час прыблізна такія:

Гарадское насельніцтва 2 000 000=19,0% *"Verhungern!"*

Сельскае насельніцтва 8 600 000=81,0% *"Verhungern zur*

Усё насельніцтва 10 600 000= 100%" [23] *Hälfte!"*[1]

Адзначым, што прыведзены рукапіс і запісы да яго патрабуюць самага сур'ёзнага навуковага аналізу як у кантэксце згаданага тэксту, так і па-за яго рамкамі, паколькі падкрэсліванні былі зроблены, на наш погляд, не самім аўтарам рукапісу, а хутчэй за ўсё распрацоўшчыкамі нацысцкай палітыкі вынішчэння і ў тым ліку праграмы забеспячэння войска прадуктамі харчавання з занятых тэрыторый. А ўсё гэта патрабуе асобнага навуковага даследавання.

Другім дакументам, да якога трэба зараз звярнуцца, з'яўляецца добра вядомая чытачам так званая "Зялёная папка" Герынга. У пяці асобных справах фонда захоўваюцца арыгіналы выданняў "Дырэктыў для вядзення гаспадаркі на новазанятых усходніх тэрыторыях", падрыхтаваных і выдадзеных эканамічным штабам з чэрвеня 1941 да ліпеня 1943 г. у 6-ці выданнях, адпаведна: 3 — першай часткі (Teil I) і 3 — другой (Teil II). Іх грунтоўнае вывучэнне для айчыннага чытача вынікае з шэрага розных прычын. Адной з галоўных з'яўляецца, на наш погляд, адсутнасць поўнага збору другой часткі выдання агульным аб'ёмам у 215 старонак, тады як у айчынных зборах змест перакладзеных дакументаў не заўсёды поўны і вельмі часта прыведзены з купюрамі. Напрыклад, у многіх навуковых выданнях і перыёдыцы па сёння [24] паўтараецца надрукаваны яшчэ ў 1960-я гг. пераклад "Зялёнай папкі", дзе ідзе размова пра Беларусь: *"В Белоруссии будет, вероятно, нелегко в ближайшее время найти руководящий состав, который бы лояльно работал на нас ...* (выдзелена мной. — ***С. Н.***). *С другой стороны, необходимо найти путь использования в наших интересах запасов скота, ячменя, лошадей и древесины и т. д."* [25]. Як бачна з цытаты, у выданнях савецкіх часоў дакумент падаваўся з купюрамі. Дык што не патрапіла ў нашым выпадку на старонкі друку? Толькі заключная частка сказа пасля слова нас: *"потому что белорусы в интеллектуальном*

---

[1] У першым і ў другім выпадках нямецкамоўныя словы — "sollen sterben", "sterben" і "verhungern", "verhungern zur Hälfte" — пакінуты мной без перакладу з намерам іх выдзялення на фоне надрукаванага тэксту. Іх азначэнні: "павінны памерці", "памерці" і "марыць голадам", "напалову замарыць голадам". Нямецкамоўная надпіска ў рукапісе на краі аркуша неразборлівым почыркам вымусіла аўтара гэтых радкоў звяртацца за дапамогай да супрацоўніц чытальнай залы архіва і бібліятэкі Федэральнага ваеннага архіва ў Фрайбургу. Выказваю ***ўсім*** шчырую падзяку за дапамогу.

*отношении далеко отстают от живущих там великороссов, евреев и поляков"*[1] [26]. Каментарыі тут не патрэбны, а неабходны дакладны ці скрупулёзны аналіз практычна ўсіх апублікаваных у савецкія часы дакументаў.

Трэцім цікавым і архіважным для даследчыкаў дакументам можна назваць "блакітную папку", пакуль малавядомую для беларускіх даследчыкаў, аднак ахарактарызаваную ў сучасных нямецкіх даследаваннях як "ключавы дакумент па гісторыі другой сусветнай вайны" [27, с. 6]. Размова ідзе аб 969 архіўных дакументах эканамічнага штаба Ост, якія знайшлі адлюстраванне ў заключным дакладзе, што пачаў рыхтавацца ў сакавіку 1944 г. спецыяльнай групай [27, с. 21] ваенных супрацоўнікаў гэтай установы з выкарыстаннем багатага матэрыялу самога эканамічнага штаба Ост, а таксама дзённікаў баявых дзеянняў, дакладаў і справаздач непасрэдна падпарадкаваных яму інспекцый, каманд, груп. На думку навуковага дырэктара Цэнтра ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме доктара Рольфа-Дзітэра Мюлера, "чысты рукапіс работы" мог з'явіцца не раней мяжы 1946/47 гг. і таму не быў прадстаўлены ў якасці дакумента на Нюрнбергскім працэсе. Каштоўнасць выкананай працы заключаецца ў тым, што звыш 1100 старонак утрымліваюць канкрэтны матэрыял, у тым ліку 82 дадаткі з лічбавымі данымі, якія дазваляюць рэканструяваць гісторыю дзейнасці адной з важнейшых эканамічных устаноў Трэцяга рэйха і аб'ектыўна паказаць яе на аснове арыгінальных дакументаў.

Выкарыстанне згаданых і іншых архіўных фондаў у якасці крыніц гістарычных даследаванняў па гісторыі акупацыі Беларусі можна лічыць бясспрэчным фактам сучаснай нямецкай гістарыяграфіі. Аб важнасці яе асобных навуковых даследаванняў для беларускіх гісторыкаў сведчаць нават назвы прац, якія ў 1990-я гг. сталі на паліцы замежных кнігарняў: *Ленгард Х.* Жыццёвая прастора на Усходзе. Немцы ў Беларусі 1941—1944. Дзюсельдорф, 1991; *К'яры Б.* Нямецкае грамадзянскае кіраўніцтва ў Беларусі 1941—1944: Работа акруговых камісарыятаў з улікам асобага значэння сельскагаспадарчых кіраўнікоў. Франкфуртна-Майне, 1991; Будні па-за фронтам. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі 1941—1944. Дзюсельдорф, 1998; *Бенц В.* Выкарыстана ў "Рэйхскамісарыяце Остланд": Дак. па генацыду ў краінах Прыбалтыкі і Беларусі 1941—1944. Берлін, 1998; *Міхаэліс Р.* СС-зондэркаманда Дзірлевангер: прыклад нямецкай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі. Берлін, 1998; *Герлах Х.*

---

[1] Аўтар прытрымліваецца тут рускамоўнага варыянту перакладу па прычыне таго, што зроблены дадатак захоўвае, такім чынам, стыль рускамоўнага кантэксту.

Скалькуляваныя забойствы. Нямецкая эканамічная палітыка і палітыка вынішчэння ў Беларусі 1941 па 1944. Гамбург, 2000. Падкрэслім, што ўсе гэтыя працы падрыхтаваны на аснове дакументальных матэрыялаў, якія выяўлены даследчыкамі не толькі ў фондах Федэральнага ваеннага архіва ў Фрайбургу, але і ў шмат іншых архівах, у тым ліку і ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

У заключэнне адзначым, што перад айчыннымі гісторыкамі, якія займаюцца даследаваннем гісторыі нямецкай акупацыі Беларусі, стаіць шэраг навуковых задач, вырашэнне якіх патрабуе сумесных намаганняў гістарыёграфаў, археографаў, дакументазнаўцаў па выяўленні, апрацоўцы і выкарыстанні багатага фонду Федэральнага ваеннага архіва Германіі ў Фрайбурзе.

### *Крыніцы, літаратура*


1. Das Bundesarchiv-Militärarchiv: Funktion — Geschichte — Bestände. 1989.
2. BA-MA: Findbuch R 20.
3. *Granier G.* Das Bundesarchiv und seine Bestände. 3. Auflage. Boppard am Rhein, 1977. S. 45.
4. BA-MA: Findbuch R 70.
5. *Новікаў С. Я.* Крытычны аналіз як сродак навуковага даследу архіўных матэрыялаў па гісторыі другой сусветнай вайны //Беларускі археаграфічны штогоднік. Мн., 2000. Вып. 1. С. 152—159.
6. BA-MA: Findbuch R 6.
7. BA-MA: Findbuch R 90.
8. Der Archivar. Jahrgang 45. 1992. Heft 3. S. 460.
9. BA-MA: Findbuch R 93.
10. Документы по истории Великой Отечественной войны в государственных архивах Републики Беларусь: Аннот. справ. /Авт.-сост.: *С. В. Жумарь* и др. Мн., 1998. С. 23.
11. BA-MA: Findbuch RW 41.
12. BA-MA: N 756/197: 30. Waffen-Gren. Division der SS (weissruthenische Nr. 1).
13. BA-MA: N 756/195.
14. BA-MA: Findbuch R 94.
15. BA-MA: Findbuch R 50 I.
16. BA-MA: Findbuch R 19.
17. BA-MA: Findbuch R 46.
18. BA-MA: Findbuch R 31
19. Internationaler Militärgerichtshof. Bd. 31. S. 84; Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941—1943: der Abschlußbericht des Wirtschaftsstabes Ost und Aufzeichnungen eines Angehörigen des Wirtschaftskommandos Kiew /Hrsg. und eingeleitet von

*Rolf-Dieter Müller*. Boppard am Rhein, 1991. S. 1; *Gerlach C.* Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941 bis 1944. 2. Aufl. Hamburg, 2000. S. 46.
20. Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941—1943... S. 6; *Gerlach C.* Kalkulierte Morde... S. 46.
21. BA-MA: RW 31/299: Von Dipl.-Forstwirt *E.v.Engelhardt.* Die Ernährungs-u. Landwirtschaft der Weißrutenischen Sowjetrepublik. Teil 1: Text mit 19 Anlagen. 1941. Bl. 72.
22. BA-MA: RW 31/299: Bl. 72.
23. BA-MA: RW 31/299: Bl. 11.
24. *Галавач В.* Маленечкая кропелька пад дулам аўтамата: я быў 12-гадовым рабом у фашыстаў //Народная воля. 2000. 3 сак.
25. Нюрнбергский процесс над главными военными преступниками: Сб. материалов: В 3 т. М., 1965. Т. 1. С. 179.
26. BA-MA: RW 31/128: Richtlinien für die Führung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten (Grüne Mappe); Teil I: Aufgaben u. Organisation der Wirtschaft. 1. Auflage: Juni 1941. Berlin. 1941. S. 19.
27. Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941—1943: der Abschlußbericht des Wirtschaftsstabes Ost...

*SUMMARY*

***The examination of the main funds of the german Federal Military Archives aiming at the search for original ,aterials in order to study the primary period and the history of german occupation in Belarus (1941—1944 yrs.) is offered. A similar problem reflected in modern German historiography is being analyzed.***

УДК 930.25

*С. П. Кубека*

# ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ДАКУМЕНТАХ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КАЛЕКЦЫІ “АЛЕКСАНДРЫЙСКІХ МІКРАФІЛЬМАЎ”

Буйнейшая нацыянальная драма еўрапейскай і сусветнай цывілізацый — другая сусветная вайна — сёння выклікае вялікую зацікаўленасць прафесійных даследчыкаў гістарычнага мінулага нашай краіны.

Працэс спасціжэння ваеннай гісторыі і гісторыі вайны на Беларусі адбываецца на аснове ўвядзення ў навуковы ўжытак шырокага кола новых археалагічных дакументальных крыніц. Пры іх крытычным вывучэнні, ацэнцы, аналізу і пераасэнсаванні яны